53. Установление уголовной ответственности за нарушение законов об охране труда.

### VIII. По вопросам просвещения

Народное просвещение должно быть организовано на началах свободы, демократизации и децентрализации его, понимая под этим осуществление следующих начал:

54. Свобода частной и общественной инициативы в открытии и организации учебных заведений всех типов и в области внешкольного просвещения; свобода преподавания.

55. Уничтожение всех стеснений к поступлению в школу, связанных с полом, происхождением и религией.

56. Между различными ступенями школ всех разрядов должна быть установлена прямая связь для облегчения перехода от низшей ступени к высшей.

57. Полная автономия и свобода преподавания в университетах и других высших школах. Увеличение их числа. Уменьшение платы за слушание лекций. Организация просветительной работы высшей школы для широких кругов населения. Свободная организация студенчества.

58. Количество средних учебных заведений должно быть увеличено соответственно общественной потребности; плата в них должна быть понижена. Местным общественным учреждениям должно быть предоставлено широкое участие в постановке учебно-воспитательного дела.

59. Введение всеобщего, бесплатного и обязательного обучения в начальной школе. Передача начального образования в заведование органов местного самоуправления. Организация органами самоуправления материальной помощи нуждающимся учащимся.

60. Устройство органами местного самоуправления образовательных учреждений для взрослого населения, элементарных школ для взрослых, народных библиотек, народных университетов. Развитие профессионального образования.

[1] Программа партии народной свободы (конституционно-демократической). М., 1917. С. 3—22.

В. Ф. ШАЛЬКЕВІЧ

## АЦЭНКІ КАНСТЫТУЦЫІ 3 МАЯ 1791 ГОДА Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ

XVIII стагоддзе ўвайшло ў гісторыю цывілізацыі як век Асветы, век Розуму. Выдатныя мысліцелі гэтага стагоддзя распрацавалі класічную форму асветніцкай ідэалогіі, накіраванай супраць феадалізму, дэспатызму і прыгнечання чалавечай асобы. Гуманістычныя і дэмакратычныя асветніцкія ідэі падрыхтавалі буйнейшыя буржуазныя рэвалюцыі XVIII стагоддзя — амерыканскую і французскую.

Пад уплывам амерыканскага, і асабліва французскага асветніцтва лепшыя прадстаўнікі перадавой грамадска-палітычнай думкі Рэчы Паспалітай (сумеснай федэратыўнай дзяржавы палякаў, беларусаў, украінцаў і літоўцаў, узнікшай у 1569 г. пасля Люблінскай уніі) таксама выпрацавалі выдатны помнік прававой і палітычнай думкі XVIII стагоддзя — Канстытуцыю 3 мая 1791 года, якая адкрывала магчымасць для правядзення шматбаковых рэформ на польскіх, беларускіх, украінскіх і літоўскіх землях. Аўтары канстытуцыі спадзяваліся з яе дапамогай стварыць передавыя формы грамадска-палітычнага жыцця, уступіць на шлях эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу, далучыцца да перадавых краін свету. Але, як слушна адзначыў В. Дунін-Марцінкевіч, «сумежныя царствы не згадзіліся на тое, штоб у палякаў быў такі закан, і сталі з імі ваяваць»[1].

У 1792 г. Расія і Прусія далучыліся да ўнутранай апазіцыі ў Рэчы Паспалітай, вядомай пад назвай Таргавіцкай канфедэрацыі, якая пачала барацьбу супраць ідэй і прыхільнікаў Канстытуцыі. Гэта прывяло да акупацыі краіны войскамі замежных дзяржаў, адмены Канстытуцыі, а потым да другога і трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай.

Цікава, што вышэй працытаванае меркаванне В. Дуніна-Марцінкевіча цалкам супадае з поглядамі К. Маркса і Ф. Энгельса, аб якіх, безумоўна,

беларускі пісьменнік не ведаў. Вось што пісаў, у прыватнасці, заснавальнік навуковага сацыялізму аб прычынах падзелу Рэчы Паспалітай: «У 1793 г., калі Расія, Аўстрыя і Прусія дзялілі паміж сабою Польшчу (Рэч Паспалітую — В. Ш.), гэтыя тры дзяржавы спасылаліся на Канстытуцыю 1791 года, якая была аднадушна асуджана за яе... якабінскія прынцыпы»[2].

Ф. Энгельс таксама адзначыў, што «Канстытуцыя 1791 г., абвясціўшая правы чалавека і грамадзяніна, стала штандарам рэвалюцыі на берагах Віслы, зрабіўшы Польшчу авангардам рэвалюцыйнай Францыі... Тая акалічнасць, што Польшча разгарнула рэвалюцыйны сцяг, з'явілася адной з галоўных прычын яе занявольвання»[3].

Нягледзячы на тое, што Канстытуцыя 3 мая 1791 г. дзейнічала на беларускіх землях усяго год з нечым, яна пакінула глыбокі след у памяці нашага народа. Да аналізу яе зместу звярталіся перадавыя мысліцелі Беларусі на працягу ўсяго XIX стагоддзя. Асаблівая цікавасць да ідэй Канстытуцыі назіраецца напярэдадні і ў час паўстанняў 1794, 1830 і 1863 гг., аб чым сведчаць многія гістарычныя крыніцы, і ў прыватнасці, ідэйная і літаратурная спадчына Кастуся Каліноўскага і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Зразумела, што найбольшую ўвагу гэтых выдатных прадстаўнікоў беларускай культуры прыцягвалі артыкулы Канстытуцыі, прысвечаныя сялянам. Сялянскае пытанне перш за ўсё разглядалася ў артыкуле 4 «Сялянеземляробы». Вось змест гэтага артыкула: «Сялянства, найбольш шматлікую і працаздольную частку насельніцтва, праца якога з'яўляецца галоўнай крыніцай нацыянальнага дабрабыту, прымаем пад абарону права і адміністрацыі»[4].

Гэты артыкул адкрываў магчымасць умяшання дзяржаўных судоў і адміністрацыі ў адносіны паміж панамі і сялянамі. Акрамя таго, Канстытуцыя абавязвала паноў заключаць пагадненні з сялянамі (індывідуальныя альбо калектыўныя) адносна роду, памеру і часу выканання іх павіннасцей. Гэтыя пагадненні таксама падпадалі пад абарону мясцовай адміністрацыі. Апошняя павінна была назіраць, каб абодва бакі (паны і сяляне) выконвалі пагадненне.

Выкладзеныя палажэнні Канстытуцыі па сялянскаму пытанню з пазіцый сённяшняга дня не ўяўляюць сабой нічога надзвычайнага. Але калі мы ўспомнім, што ў той час як у самой Рэчы Паспалітай, так і ў суседніх з ёй краінах прыгонныя сяляне былі цалкам бяспраўнымі, то ацэнім дасягненні Канстытуцыі ў гэтым пытанні, якая давала 75 % насельніцтва дзяржавы пачатак грамадзянскіх і чалавечых правоў [5].

Таму зразумела, чаму прававыя нормы Канстытуцыі, прысвечаныя сялянам, атрымалі станоўчую ацэнку Кастуся Каліноўскага. У сваіх бессмяротных «Лістах з-пад шыбеніцы» выдатны беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат пісаў: «Ронд (урад — В. Ш.) польскі ўжо таму будзе 70 лет, выпераджаючы многа суседніх народаў пачаў ужэ талкаваці аб свабодзе мужыцкай...»[6] (Нагадаем, што гэтыя словы былі напісаны Каліноўскім у лютым — сакавіку 1864 г. незадоўга да пакарання ў мурах былога Дамініканскага кляштару, які царскія ўлады ператварылі ў турму). Пазней К. Маркс таксама адзначаў, што Канстытуцыя 1791 г. абвясціла «скасаванне прыгоннага права»[7].

Канстытуцыя 3 мая гарантавала асабістую вольнасць тым збеглым сялянам, якія пажадалі б вярнуцца на радзіму, а таксама сялянам, прыбыўшым у Рэч Паспалітую з-за мяжы. І тым і другім гарантавалася свабода пасялення і найму на працу. Гэты артыкул Канстытуцыі вельмі высока ацаніў В. Дунін-Марцінкевіч. У «Талкаваннях» да свайго перакладу на беларускую мову паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» ён пісаў: «У тым закане стаяла, што калі хто, хаця б і з чужой зямлі ступіць нагой на польскую, той мае быць вольным чалавекам»[8].

Асаблівую ўвагу выдатных прадстаўнікоў грамадска-палітычнай думкі Беларусі XIX стагоддзя прыцягнулі артыкулы Канстытуцыі, аб народным суверэнітэце і падзеле ўлад, якія былі распрацаваны стваральнікамі асноўнага закона Рэчы Паспалітай пад уплывам ідэй вялікіх французскіх мысліцеляў XVIII стагоддзя Ж.-Ж. Русо і Ш. Л. Мантэскье. У прыватнасці, у артыкуле 5 Канстытуцыі сцвярджалася: «Усялякая ўлада ў грамадстве вынікае з волі народу»[9].

Пры гэтым неабходна адзначыць, што катэгорыя «народ» трактавалася ў Канстытуцыі значна шырэй, чым гэта рабілася да таго часу. У паняцце «народ» уключалася не толькі шляхта, як гэта было раней, але таксама мяшчане і сяляне. Гэта дэмакратычная рыса асноўнага закону Рэчы Паспа-

літай 1791 года атрымала станоўчую ацэнку Кастуся Каліноўскага. У «Лістах з-пад шыбеніцы» ён адзначыў, што Канстытуцыя паставіла пытанне аб «роўнасці братней мужыка з шляхціцам»[10].

Значную цікавасць прадстаўляе і агульная ацэнка Канстытуцыі, дадзеная В. Дуніным-Марцінкевічам. «Закон Трэцяга мая,— лічыў ён,— быў вельмі мудры і для ўсіх людзей меў прынясці шчасце»[11].

Такім чынам, Канстытуцыя 1791 года, накіраваная супраць абсалютызму, дэспатызму і шляхецка-магнацкай анархіі, паклала пачатак разнявольванню чалавечай асобы на польскіх, беларускіх, украінскіх і літоўскіх землях, мела гуманістычны і дэмакратычны характар. Менавіта таму яна і аказала значны ўплыў на развіццё грамадска-палітычнай думкі Беларусі XIX стагоддзя, на погляды яе выдатных прадстаўнікоў — Кастуся Каліноўскага і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

[1] Дунін-Марцінкевіч В. Творы. Мн., 1984. С. 472.
[2] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 4. С. 488.
[3] Там жа. Т. 18. С. 553—554.
[4] Wybór tekstów zródłowych z historii państwa i prawa polskiego. Warszawa, 1951. T. 1. Cz. 2. S. 91.
[5] Гл.: Грыцкевіч В. Наша першая Канстытуцыя // Народная газета. 1991. 7 мая.
[6] Giller A. Historia powstania narodu polskiego w 1861—1864 r. Paryż, 1867. T. 1. S. 328.
[7] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 4. С. 488.
[8] Дунін-Марцінкевіч В. Творы. С. 472.
[9] Wybór tekstów zródłowych... S. 90.
[10] Giller A. Historia powstania... S. 328.
[11] Дунін-Марцінкевіч В. Творы. С. 472.